# У ЯЕ АСАБІСТЫ РАХУНАК ДА ТОЙ ПРАКЛЯТАЙ ВАЙНЫ

## З успамінаў Л. М. Габец, в. Мянькі

### *Такое кароткае дзяцінства*

Вёска Мянькі ляжыць у двух кіламетрах збоч дарогі на Кватары. Перад тым страшным 41-ым Любе было дзевяць год. Жылі яны, Зарэцкія, бедна, у малой хаціне з кухняй і адным пакоем.

- Летам гэтым папрасіла я дзяцей, каб завязлі мяне машынай да таткавай хаты, - расказвае яна. - Сама не дайду ўжо, ногі баляць. Глянула, якая яна, тая хатка, маленькая, як у зямлю ўрасла, і сама не магла паверыць, што ўвасьмярых мы там жылі: бацькі, чацвёра дзяцей і абедзьве бабулі нашы. Ды што там мы. Усе так цясніліся...



*Л.М. Габец.*

У вёсцы шэсцьдзесят хат было, і ў кожнай па пяцёра-шасцёра дзяцей. Незайздросна адзін да аднаго людзі жылі. У помач сусед суседу станавіўся, раіўся, апошнім кавалкам дзяліўся.

- Помню, маці наша хлеб пячэ. Зойдзе хто якраз у хату, дык яна просіць: «Пачакайце, хутка боханы даставаць буду, пачастуеце-ся». А калі яшчэ месіць цеста - возьме, скачае галушку і падае: маўляў, у хаце спячэш.

Залатое ў мяне было дзяцінства - уздыхае Любоў Міхайлаўна. - Хаця і надта ж кароткае. Прачнуся, бывала, ранкам, і аж сэрца заходзіцца ад шчасця: усё тваё - і вёска ў зялёных прысадах, і лугі, і алешнік, і лес, і рачулка, і сонца цёплае, і дожджык з вясёлкаю, да якой бяжыш-бяжыш і не можаш дабегчы... Якія толькі гульні мы ні ладзілі, якіх выдумак-забаў ні прыдумвалі!

А неўзабаве непадалёку ад Мянькоў, каля Кватараў, - напрасткі кіламетры з тры - пачалі будаваць ... аэрадром. Нам дзецям, гэтак ужо цікава было! Многа свежых людзей наехала, мужчын з вазамі з блізкіх і дальніх вёсак. І ў Мяньках тыя людзі кватаравалі - у нас, помню пяцёра дзядзькаў начавала - хто ў хаце, хто на сенавале. Ваенны гарадок рос

проста на вачах, а ў ім магазіны, сталовая. Помню, наша суседка і сваячка Вера афіцыянткай у той сталовай працавала.

А потым на аэрадроме самалёты з'явіліся. Гэта ж якое шчасце было паглядзець на тых дзівосных жалезных птушак з чырвонымі зоркамі на крылах! А пад вечар мы, дзеці, што тыя вераб'і, збіраліся каля акна хаты у якой кватараваў ваенны са сваёй жонкай-прыгажуняй Ксеніяй - на акне стаяў і іграў патэфон.

Вечарамі, да стомы перапоўненыя ўражаннямі, ледзь дабіраліся да хаты, каб назаўтра рабіць новыя адкрыцці.

... Потым, стаўшы ўжо дарослай, Любоў Міхайлаўна зразумела: кожны той бесклапотны дзень сапраўды быў для яе на вагу золата. Бо надта кароткім аказалася шчаслівае дзяцінства. А тады... А тады яна быццам спяшалася і жыць, і радавацца, і смяяцца.

### *«Куды ж вы едзеце? Вайна!»*

Любін бацька, Міхась Зарэцкі, быў чалавекам аўтарытэтным, талковым і майстравым. Печы ўмеў класці. Жывёлу мог лячыць. Людзі яго паважалі. А яшчэ Міхась Іванавіч быў чалавекам глыбока веруючым.

- У нядзелю, 22 чэрвеня, тата паехаў, як звычайна, у царкву, - расказвае Любоў Міхайлаўна. - Але і паўдарогі не праехаў, як пачуліся моцныя выбухі.

- А гэта ўжо бамбілі аэрадром, - успамінае далей мая субяседніца. - Самалёты з чорнымі крыжамі раўлі так нізка, і вухкала наўкол так цяжка, што дрыжала, стагнала зямля. Мама ўсіх нас, дзяцей, - за дарогу, у яму для бульбы. Помню, брат Валодзя крычыць мне: «Адхініся, камень падае». А гэта яма была камянямі выкладзена, і ад бамбёжкі тыя камяні варочаліся. Над аэрадромам агонь і дым да неба стаялі. Казалі, кватарскія хаты блізка каля лятніска таго былі. І дзеці непадалёк гулялі. То адна маці толькі чаравічак дачушкі знайшла, а само дзіця прапала. А цётцы Надзі Гурскай нагу адарвала асколкам…

### *Акупацыя*

Так раптоўна скончылася дзяцінства. Любові Міхайлаўне час акупацыі запомніўся, як нешта надта чорнае, злое.

- Помню, як фашысты ўпершыню прыехалі ў вёску на матацыклах. Шваргіталі нешта па-свойму, крычалі, загадвалі. Як парася мы тайком трымалі,- апавядае. - Татка выкапаў у кладоўцы яму, туды хавалі сала і мяса.

Ноччу бацькі часта спалі ў вопратцы, бо часам раптоўна нейкая страляніна ўсчыналася.

А яшчэ дзіцячая памяць жанчыны захавала, як маці давала Валодзі, яе старэйшаму брату, хлеб і сала. І казала: «Нясі з сябрукамі, няхай тыя

хлопцы паядзяць. Гэта ж чыесьці дзеці...» А сама выцірала ражком хусцінкі слёзы. Люба чула, што ў лесе ёсць зямлянка, там хаваюцца чырвонаармейцы, брат носіць ім паесці. Пазней яна зразумее, як рызыкавала маці ўсёй сваёй сям'ёй.

Фашысты забіралі хлопцаў і дзяўчат у Германію. З іх Мянькоў на чужыну паехалі Жэня, Ліда, Ніна. Многія мужчыны не вярнуліся з вайны.

Шмат помніць яна, вядома, не можа. Дарослыя на ўсе пытанні адказвалі. «Вам, дзеці, не трэба многа ведаць. Але помніце: фашысты - вельмі кепскія людзі, страшныя. Іх трэба баяцца».

## *«Зрабі мне, Любачка, ляльку...»*

У ліпені 44-га зноў уся вёска была ў алешніку. Немцы адступалі, і людзі баяліся, што падпаляць вёску ці ўчыніцца бой. Але прагучаў-толькі адзін выбух - фашысты ўзарвалі непадалёк мост на дарозе.

Следам уцякалі паліцаі. Яны, мусіць, паспявалі і па хатах рабаваць.

- Помню, як камары загрызалі нас,- кажа Любоў Міхайлаўна. - Сямігадовая Іра плакала, а мама ўгаворвала яе: «Спі, дзетка, хутка будзем дома. Немцы ўцякаюць, яны нікога не рушаць».

А назаўтра мы і праўда былі ў хаце. Пераначавалі ноч. Ранкам, калі браты ўжо былі на вуліцы, а дарослыя корпаліся ў двары, Іра папрасіла: «Зрабі, Любачка, ляльку, я з ёю пагуляю». З чаго зрабіць тую ляльку? З анучаў, вядома. А знайсці іх можна ў пячурцы, вымураванай у печы. Я пайшла на кухню, падняла руку - тая пячурка была на ўзроўні майго росту - і пацягнула нейкую шкарпэтку...

Выбух быў такой сілы, што разарвала печ, падняло столь і вырвала акно. Не ведаю, як уцалела і мая рука, і я сама. Помню, страшэнна пеканула па твары, і я страціла прытомнасць. Як аказалася, надоўга.

Дванаццацігадовая Люба засталася жывою сапраўды цудам. Яе агледзеў і аказаў першую дапамогу савецкі ваенны ўрач - нашы войскі ўжо занялі мясцовасць. Потым лячыў доктар Касакоўскі ў Белым Дворку.

- Мамачка, разбудзі мяне, я не магу прачнуцца,- трызніла дзяўчынка. - Мамачка, дастань мяне, я не магу больш у гэтым чорным калодзежы...

Твар быў суцэльным струпам. Люба чула спачувальны шэпат хворых. «Няхай бы ўжо й забіла гэтае дзіця. І само не пакутавала б усё жыццё, і бацькі, на яе гледзячы. Як дзяўчыне з такім тварам і сляпой жыць на свеце?».

А доктар нязменна супакойваў: «Не хвалюйся, усё пройдзе, і зрок будзеш мець, і замуж за прыгожага хлопца выйдзеш. Толькі шчыра маліся Богу».

Гэта было ў ліпені. І толькі цераз зіму, аж у красавіку, дзяўчынка пачала адрозніваць дзень ад ночы. У правым воку не было зрэнкі, а левым як у тумане бачыла ўсё, як у малацэ. Адсекла ёй і кончык вуха.

Твар загойваўся доўга, ох доўга. Калі струп злез - твар застаўся, ад апёку порахам, сінюшным. Ад Любы хавалі люстэрка. Яе вазілі да дактароў у Гродна, брат пісаў пісьмо аж у Мінск, прасіў кансультацыі ў тамашніх урачоў. Да шаснаццаці год Люба не здымала павязкі з вока.

У вёсцы і старыя людзі, і аднагодкі шкадавалі дзяўчынку, берaглі, не кпілі. Затое тыя, хто не ведаў пра яе бяду, падчас неасцярожна, самі таго не хочучы, ранілі яе.

- Помню,- расказвае,- братава вяселле было. Ехалі вазамі аж пад Рось. У адной вёсцы й смяюцца з мае павязкі: «Дзе вы такую параненую дружку ўзялі?!». Я - у слёзы, а моладзь мяне супакойвае. Яшчэ не забуду ніколі, як у царкву ў Бераставіцу з дзяўчатамі пайшла. Нейкая жанчына, што сустрэлася нам, жахнулася: «Дзетачка, чаму ты не памылася, гэта ж у храм Божы ідзеш».

Усё гэта трэба было пераЖыць, пераадолець.

Пра замужжа Люба марыла, вядома, але нікому нават не расказвала пра свае мары - саромелася. Толькі помніла сон, што сніла яшчэ ў бальніцы ў Белым Дворку. Быццам бы хлопец з іхняй вёскі плыве ў чоўні па чыстай быстрай рэчцы. І яна, Люба, скочыла ў той човен і паплыла разам з ім...

## *Сямейнае шчасце*

Той сон аказаўся прарочым. Да Любы пасватаўся - хто б вы думалі? - якраз той хлопец Іван, які правіў у сне чоўнам. І плылі яны разам па жыцці 42 гады. Хату прасторную, на чатыры пакоі, паставілі, і ў ёй такі парадак яна, гаспадыня, падтрымлівае - залюбуешся! Дзвюх харошых дачушак выгадавалі. Іван Габец талковым, працавітым чалавекам аказаўся, трактарыстам працаваў, і нездарма яму званне заслужанага калгасніка прысвоілі.

- Ён, як і я, надта кветкі любіў. Людзі, бывала, з рынку штосьці да ўжытку хатняга вязуць, а мы - ружы, півоні, вяргіні, каб пасадзіць каля хаты, -кажа Любоў Міхайлаўна. - Затое кветкі не толькі нашу сям'ю, але і ўсіх вяскоўцаў радуюць. На жаль, няма ўжо Івана, чатырнаццаць год, як памёр.

А яна, Любоў Міхайлаўна, жыве бясконцай любоўю сваёй да дзяцей і ўнукаў –праўнукаў.

- Мне ўсё жыццё шанцавала на добрых людзей, - кажа. – А гэта так многа значыць!

Марыя Драпеза, в. Мянькі, 2010 год.